СВЯТА НАТХНЕННЯ І СУМЛЕННЯ

Дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі пабывала на XXXI Дні беларускага пісьменства ў горадзе Івацэвічы Брэсцкай вобласці.

31 жніўня – 1 верасня прадстаўнікі літаратурнай Гродзеншчыны паўдзельнічалі ў шэрагу мерапрыемстваў, сустрэліся з калегамі з іншых абласцей, прадставілі грамадскасці свае кнігі і творы, завязалі новыя знаёмствы, атрымалі ўзнагароды. Першае назіранне: гродзенская дэлегацыя атрымалася самай маладзёжнай. Гэта не можа не радаваць і дае падставы для аптымізму. Удзельнікамі свята сталі: паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён); паэтэса Ірына Войтка (Слонім); паэтэса, публіцыст Тамара Мазур (Скідзель); гродзенскія паэтэсы Кацярына Каламійцава і Юлія Мельнік; паэт, публіцыст, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур; маладыя паэты Вольга Алізар і Андрэй Дарожкін; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Кіраўнік дэлегацыі – старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, вядомая беларуская паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч.

Сёлета нацыянальнае свята мастацкага слова прайшло пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва ў Рэспубліцы Беларусь, 85-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР, а таксама 90-годдзя Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэтым падзеям у той ці іншай ступені адпавядаў ідэйна-тэматычны змест твораў, з якіх складалася творчая прэзентацыя літаратурнай Гродзеншчыны. Сёлета таксама святкуе юбілей наша вобласць, і гродзенцы дадалі да гэтага канцэптуальнага падмурку тэму 80-годдзя ўтварэння Гродзенскай вобласці. Аснову літаратурна-музычнай праграмы ГрАА СПБ пад назвай «Наша слова – незалежнай Беларусі» (фестываль кнігі і прэсы, павільён «Слова пісьменніка») склала патрыятычная лірыка. Акрамя паэтычнай, з уласнай песеннай творчасцю ў пісьменніцкім павільёне выступіў Андрэй Татур.

Л. А. Кебіч

Таццяна Яцук

Ірына Войтка

Тамара Мазур

Кацярына Каламійцава



Юлія Мельнік

Андрэй Татур

Дзмітрый Радзівончык

Вольга Алізар

Андрэй Дарожкін

На свяце экспануюцца кнігі, выдадзеныя пісьменнікамі Прынёмання

Можна канстатаваць, што аб'яўлены ў Беларусі Годам якасці 2024 год праходзіць для літаратурнай Гродзеншчыны даволі плённа. Дзякуючы арганізаванаму ў горадзе Масты (Гродзенская вобласць) Першаму рэспубліканскаму фестывалю паэзіі «Масты сугучнасці» і абласному семінару маладых літаратараў Гродзеншчыны, на новы якасны ўзровень ступіла Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі і спадзяемся, ступіць літаратурнае жыццё нашага рэгіёна. А мінула яшчэ толькі першае паўгоддзе… З рук старшыні ГрАА СПБ Л. А. Кебіч паэтэсы Таццяна Яцук, Тамара Мазур, а таксама пісьменніца і радыёвядучая Зоя Кулік-Капуста (Нясвіж) атрымалі падзякі Саюза пісьменнікаў Беларусі за актыўны ўдзел у Рэспубліканскім фестывалі паэзіі «Масты сугучнасці».

З калегамі з Магілёва. Чацвёрты з правага боку – старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Алесь Мікалаевіч Казека

З калегамі з Віцебска. Пятая з левага боку – старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Тамара Іванаўна Краснова-Гусачэнка

У Івацэвічах стаіць 30-градусная спякота, а сэрцы людзей напаўняе радасць ад цёплых сяброўскіх сустрэч

Л. А. Кебіч і старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік, публіцыст, Леанід Міхайлавіч Крыванос

Вельмі радасна, што ніводны Дзень беларускга пісьменства не абыходзіцца без перамог нашых аўтараў у рэспубліканскіх літаратурных конкурсах. Прызёрамі абвешчанага Брэсцкім абласным аддзяленнем СПБ Рэспубліканскага конкурсу паэтычных зборнікаў імя Яўгеніі Янішчыц сталі адразу чатыры прадстаўніцы Гродзенскай вобласці – паэтэсы Людміла Кебіч, Таццяна Яцук, Вольга Алізар і Кацярына Каламійцава. Дыпломы і памятныя падарункі пераможцам уручыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч *(на здымку)*. Сардэчна віншуем нашых калег з гэтымі перамогамі, узнагародамі і зычым новых важкіх дасягненняў. Так трымаць!

Сучасны літаратар даўно ўжо перасягнуў місію «інжынера чалавечых душ». Хутчэй, сёння гэта выратавальнік, тэрапеўт, лекар. Нездарма неўміручы Ф. Скарына называў кнігу лекамі для душы. Здабываючы ўрокі з поўнай трагічных старонак шматвяковай гісторыі нашага народа, кожны з нас добра разумее, што галоўнымі ў сістэме каштоўнасцей з'яўляюцца мірнае неба над галавой, спакойнае, гарманічнае жыццё на роднай зямлі, упэўненасць у заўтрашнім дні, адзінства і згода ў грамадстве. Менавіта адным з такіх урокаў памяці, міру і згоды стаў унікальны паэтычны марафон Саюза пісьменнікаў Беларусі пад назвай «Мая ты родная зямліца», што адбыўся ў цэнтры Івацэвічаў, ля мемарыялу «Памяці спаленых вёсак». У выкананні паэтаў з

розных куткоў краіны прагучалі творы патрыятычнай тэматыкі. Не засталіся ў баку (наадварот, аказаліся самымі актыўнымі) і прадстаўнікі літаратурнай Гродзеншчыны. Напрыклад, Людміла Кебіч прачытала ўласны верш «Я – дачка ветэрана». Кацярына Каламійцава выступіла з творам «Сила колыбельной» адразу на трох мовах – беларускай, рускай і ўкраінскай, а Дзмітрый Радзівончык прачытаў лірычнае прысвячэнне «Івацэвічам», напісанае ў жанры акраверша (чытаецца па гарызанталі і па вертыкалі), якое тут жа было падорана гаспадарам свята. *Фота з мерапрыемства – унізе.*



А потым былі незабыўны гала-канцэрт з фантастычнай сцэнаграфіяй, цырымонія ўрачыстага адкрыцця свята, уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Неба над Івацэвічамі асвяціў святочны салют... Сардэчна віншуем усіх лаўрэатаў і перадаем асобнае сяброўскае прывітанне ўраджэнцу Зэльвы Уладзіміру Мінавічу Мазго, кніга якога прызнана лепшым выданнем для дзяцей. Першы дзень восені таксама прынёс нямала ўражанняў і эмоцый. Людміла Антонаўна выступіла на галоўнай сцэне ў праграме традыцыйнага канцэрта Саюза пісьменнікаў Беларусі пад назвай «Зямны паклон табе, Радзіма». Наш кіраўнік прачытала свой верш «Беларусі» і выканала песню «Дарагі куточак» (словы Людмілы Кебіч, музыка Генадзя Кебіча). Гродзенская дэлегацыя працягнула сустракацца з калегамі, даследваць Івацэвічы і знайшла ў сталіцы XXXI Дня беларускага пісьменства нямала цікавага. Да гасцей з Прынёмання далучыўся і таксама выступіў у канцэрце СПБ дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паэт Валянцін Семяняка (Зэльвенскі раён). На развітанне госці з Гродзеншчыны падарылі свае кнігі з аўтографамі куратару нашай дэлегацыі Аксане Паўлаўне Рэвенка, дзякуючы якой знаходжанне дэлегацыі ў Івацэвічах было вельмі камфортным. Адным істотным арганізацыйным недахопам стала супадзенне па часе рэпетыцыі гала-канцэрта з працай павільёна «Слова пісьменніка», з-за чаго чутнасць выступленняў літаратараў часам набліжалася да нуля. Арганізатары проста абавязаны звярнуць на гэта ўвагу ў перспектыве. Тым больш, што наступны, XXXII Дзень беларускага пісьменства будзе прымаць другі па велічыні горад Гродзенскай вобласці, старажытная Ліда. Пажадаем адзін аднаму, каб і праз год свята ўсіх, хто любіць кнігу і літаратуру, хто ведае толк у культуры чытання і кнігавыданні, атрымалася святам не толькі творчага натхнення, але і грамадзянскага сумлення.

Падчас урачыстага адкрыцця XXXI Дня беларускага пісьменства быў агучаны прывітальны ліст ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі

На сцэне – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Вікторыя Алешка, уладальніца медалі Францыска Скарыны. Мае самы нізкі жаночы пеўчы голас — кантральта

1 верасня. Канцэрт «Зямны паклон табе, Радзіма». Спявае Людміла Кебіч

Трэці з правага боку – старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Міхась Паўлавіч Пазнякоў

Чацвёрты з правага боку – член Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, паэт-дэпутат Валянцін Семяняка



Літаратурныя інсталяцыі пад адкрытым небам


ЯНКА КУПАЛА
А хто там ідзе?
YANKA KUPALA
And, say, who goes there?
IN THE LANGUAGES OF THE WORLD
2018
БЕЛАРУСЬ
BELARUS
Паслянне свету
Послание миру
Message to the world
Владимир
МУЛЯВИН
«Сэрцам і думамі...»
2016
Беларускі касцюм
2018
КУПАЛА
ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ
2019

Крайні з правага боку – літаратурны краязнавец Алесь Хітрун (Ліда)

.

КЛІЧ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА
НА БОЙ, НА ВОРАГА, ПАРТЫЗАНЫЯ
Узнімайся, народзе мой, на вялікую расплату!

ДЫПЛОМ
РАДЗІВІЛЫ
АЛЬБОМ ПАРТРЭТАЎ
СУСВЕТНАЯ СПАДЧЫНА
ФРАНЦЫСКА
СКАРЫНЫ

СПАДЧЫНА
СПАДЧЫНА
ПОЛЧЫК І ЛЁТЧЫК

Заўсёды рады вітаць!
1882
З Купалам у сэрцы
КРАЙ
СПАДЧЫНА
БЕЛАЗІРФСТРАХ

Фестываль
кнігі і прэсы

Сэлфі – справа (не)сур′ёзная…

Канцэрт закрыцця XXXI Дня беларускага пісьменства. На сцэне – легендарныя «Песняры»

Да сустрэчы праз год у Лідзе!

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Фота
Віктара Іванчыкава,
Юліі Мельнік,
Анатоля Яцука,
Кацярыны Каламійцавай,
Вольгі Алізар,
Андрэя Дарожкіна,
Дзмітрыя Радзівончыка

Яшчэ па тэме:

Як у Івацэвічах праходзіць Дзень беларускага пісьменства? | zviazda.by

XXXI Дзень беларускага пісьменства прайшоў у Івацэвічах | zviazda.by

Сэрцы, адкрытыя слову | zviazda.by